# Маральныя каштоўнасці і будучае чалавецтва

Самым важным дасягненнем апошніх гадоў прынята лічыць навукова-тэхнічны прагрэс. З кожным годам становіцца ўсё цяжэй падрыхтаваць падлеткаў да будучага самастойнага жыцця. Доўгі час лічылася, што чалавек – гэта толькі біялагічны від, які развіваецца згодна законам эвалюцыі прыроды. Аднак у апошнія гады ўсе вучоныя сцвярджаюць, што акрамя біялагічнага пачатку ў кожным з нас прысутнічае і духоўны, што існа адрознівае нас ад іншых біялагічных відаў. Таму я лічу неабходным асаблівую ўвагу ўдзяляць духоўна-маральнаму выхаванню, якое ўключае ў сабе і грамадзянска-патрыятычнае, і ідэалагічнае, і гендарнае. Гісторыя паказвае, што каханне, цнатлівасць, вернасць, павага, міласэрнасць, дабрыня бяруць пачатак з далёкага мінулага, з паяўлення першых людзей на зямлі. А час паказвае на тое, што нашаму сучаснаму грамадству не хапае гэтых якасцей.

Доўгі час сістэма адукацыі абмяжоўвала ўзаемадзеянне царквы і школы, але праваслаўная культура ў сістэме адукацыі мае вялікі выхаваўчы патэнцыял. Яна заклікае рашаць даволі няпростую задачу – навучыць дзяцей разбірацца ў сапраўдных каштоўнасцях, дапамагчы ім у выбары свайго жыццёвага шляху, у фарміраванні духоўна-маральнага пачатку.

Некаторыя вучні, пачуўшы аб царкве, негатыўна ўспрымаюць інфармацыю. Прыходзіцца па крупінках, неназойліва, у займальнай форме знаёміць іх з агульначалавечымі каштоўнасцямі. Так прыйшло рашэнне выхоўваць вучняў на аснове краязнаўчых праваслаўных традыцый, паколькі роднае заўсёды здаецца блізкім і правільным.

Значную ролю ў духоўным выхаванні адыгрывае правядзенне факультатыўных заняткаў у 6 класе "Біблія як помнік гісторыі і літаратуры". Дзеці вучацца любіць, у першую чаргу, сябе і сваё жыццё, родных, сяброў, суседзяў, жывёл і ўсё, што іх акаляе. Прачытаныя апавяданні вучаць школьнікаў быць добрымі, міласэрнымі, чулымі да чужога болю. Прытчы застаўляюць дзяцей думаць, разважаць аб каштоўнасці жыцця, аб чалавечай дабрыні і бязлітаснасці, аб праўдзе і падмане, аб бескарыснасці і баязлівасці.

Пры вывучэнні біблейскіх сюжэтаў ляжаць талерантныя адносіны да духоўнай культуры. На факультатыўных занятках імкнуся сумесна з дзецьмі знайсці ісціну пазнання духоўнасці. Неабходна ўмела і далікатна спалучаць дадзеныя гісторыі, археалогіі, этнаграфіі з пункту погляду рэлігіі. Выкарыстанне на занятках інтэгрыраваных сувязей з гісторыяй, літаратурай і выяўленчым мастацтвам дае свой плён. Знаёмячыся са зместам асобных частак Бібліі, вучні пашыраюць свой кругагляд і веды па многіх школьных дысцыплінах, папаўняюць дэфіцыт духоўнасці. У выніку развіваецца здольнасць самастойна і глыбока разважаць аб сэнсе жыцця.

Правядзенне факультатыўных заняткаў у розных формах (эўрыстычнай гутаркі, паведамленняў, прагляду відэафільмаў, віртуальных экскурсій, праслухоўвання і выканання песень, выразнага чытання вершаў, практычных заняткаў, гутарак за круглым сталом у прысутнасці мясцовага святара Свята-Пакроўскай царквы в.Пачапава Баранавіцкага раёна Віталія

Вабішчэвіча, правядзенне хвілін творчасці і інш.) дае магчымасць сцвярджаць, што выхаванне вучняў на аснове праваслаўных традыцый прыносіць свае станоўчыя вынікі. У дзяцей пастаянна прысутнічае пацвярджэнне каштоўнасцей чалавечага жыцця, што вельмі актуальна ў наш час у сувязі з павелічэннем суіцыдаў сярод падлеткаў.

Выхаванне асноўным чалавечым каштоўнасцям: дабру, міласэрнасці, спачуванню - адбываецца натуральна, неназойліва і непрыкметна. Вучні разумеюць, што самае асноўнае – гэта мець Бога ў сваім сэрцы, у сваёй душы, тады ніякія цяжкасці не зламаюць сілы волі, веры ў пераможнасць дабра і справядлівасці.

Гісторыя духоўнага адраджэння жыхароў вёскі Пачапава Баранавіцкага раёна пачалася з адраджэння Свята-Пакроўскай царквы і адраджэння Свята-Троіцкай царквы ў в. Вялікая Сваротва. У адраджэнні мясцовых святынь прымала ўдзел і школа.

У многіх гарадах і вёсках ёсць храмы. На вялікі жаль, былі такія часы калі рэлігія прыгняталася, вернікаў праследавалі, знішчалі кнігі, разбуралі храмы. Але людзі ўсё роўна захавалі сваю веру, аб’ядноўваліся, каб захаваць абразы, кнігі, святыні. Гісторыя і час бязлітасныя да любых будынкаў, у тым ліку і да культавых збудаванняў.

Зараз у нашай краіне свабода ідэалогіі і выбару веры. Чалавек сам выбірае свой шлях. Людзі, чыя вера моцная, выступаюць асноўнымі ініцыятарамі аднаўлення страчанай спадчыны. Многія людзі доказваюць сваю веру не толькі словамі, але і ўчынкамі.

У нашай мясцовасці таксама былі храмы, сцены якіх доўгія гады зеўралі сваімі руінамі. Свята-Пакроўская царква ў в.Пачапава і Свята-Троіцкая царква ў в.Вялікая Сваротва за сваё існаванне перанеслі многае: першапачатковыя пабудовы былі драўляныя і належалі ўніятам, затым на месцы драўляных пабудоў з’явіліся каменныя, потым у час Вялікай Айчыннай вайны яны былі разбураныя і ў пачатку XXI стагоддзя адноўленыя. Гісторыя храма – гэта не проста яго апісанне. Гэта неад’емная частка гісторыі вёскі, людзей, якія жылі раней і цяпер жывуць і потым будуць жыць. Царква захоўвае ў сабе духоўную частку гісторыі нашых вёсак, што складана растлумачыць у звычайнай біяграфіі або гістарычнай кнізе.

Можна па-рознаму адносіцца да рэлігіі і царквы, але вядома толькі адно: храм у вёсцы заўсёды быў, ёсць і будзе не толькі рэлігійным цэнтрам, але і ачагом культуры, сімвалам адзінай цывілізацыі.

Мы, настаўнікі і вучні ДУА “НПК Пачапаўская дзіцячы сад – сярэдняя школа”, жыхары вёскі Пачапава і акаляючых вёсках, вельмі ганарымся тым, што ў пачатку XXI стагоддзя адрадзіліся нашы мясцовыя святыні: Свята-Пакроўская царква ў в. Пачапава і трохкутная, адзіная ў Еўропе, Свята-Троіцкая царква ў в. Вялікая Сваротва, якая знаходзіцца прыкладна каля чатырох кіламетраў ад в. Пачапава. На тэрыторыі Пачапаўскага сельскага выканаўчага камітэта Баранавіцкага раёна, які ўключае 19 вёсак, ёсць толькі дзве гэтыя цэркаўкі, у якія з’язджаецца народ з усіх ваколіц у час свят на Багаслужэнні і на агульную малітву. Храмы для мясцовых вернікаў

з'яўляюцца цэнтрам культуры. Да нас прыязджае шмат паломнікаў не толькі з Беларусі, але і з іншых краін. Адзін раз у два гады нашу школу і храмы наведваюць госці з Германіі.

Цяжкі лёс напаткаў нашы святыні ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Яны былі спалены ў 1943 годзе. Доўгія гады сваімі руінамі храмы напаміналі аднавяскоўцам аб тых жудасных днях ваеннага ліхалецця. Пачапава па шчасліваму выпадку ўцалела. Немцы хацелі здзейсніць з ёй тое, што зрабілі з Хатынню, з Застарыннем і многімі іншымі беларускімі вёскамі. Карнікі сабралі ўсіх людзей на плошчы, непадалёк ад царквы, каб потым загнаць іх у некалькі дамоў і спаліць. Відаць, шчырая малітва да Бога, якая ішла ад сэрца кожнага верніка, дапамагла ўцалець Пачапаву і яе жыхарам.

Пратыерэй Георгій Сапун больш паўстагоддзя прысвяціў прыходу ў невялікай капліцы Святога Мікалая, якая і цяпер стаіць на вясковых старых могілках. Нават у самыя цяжкія атэістычныя гады бацюшка верыў і маліўся з надзеяй, што яго словы пачуюцца і храмы будуць адноўлены. Не давала думка спакою сабраць гэтыя святыя камяні, так як ад храмаў засталіся толькі адны руіны. І час прыйшоў, камяні леглі там, дзе ўсклалі іх нашы продкі.

Ступіўшы на прыступку святога месца, адразу адчуваеш палёгку на душы. Амаль усе віды мастацтва сабраны ў адным месцы. Чытанне малітваў, спеў царкоўных песень на клірасе, мноства ікон з выявамі святых, незвычайныя архітэктурныя формы – усё, што мы можам бачыць і чуць ў царкве. У Свята-Пакроўскім храме на сценах вісяць вялікія шыльды, на якіх увекавечаны прозвішчы і імёны аднавяскоўцаў, якія аддалі сваё жыццё ў гады вайны за тое, каб мы цяпер жылі пад мірным небам, каб мы самі былі гаспадарамі на нашай самай прыгожай і квітнеючай Радзіме.

Аднаўленне Свята-пакроўскай царквы ў в. Пачапава прысвечана памяці ахвярам Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ўсім нявінна забітым ў ХХ стагоддзі ў г.Баранавічы і Баранавіцкім раёне.

Такім чынам, збіраючыся ў гэтай царкве, мы заўсёды будзем памятаць аб нашых абавязках: захоўваць гістарычную памяць, ствараць мір у нашых душах, клапаціцца аб сваёй малой радзіме, з верай і надзеяй праходзіць свой жыццёвы шлях, жыць у згодзе з сабой і людзьмі, быць добрымі і міласэрнымі.

Свята-Троіцкая царква ў Вялікай Сваротве – гэта адна з самых загадкавых пабудоў у мясцовасці, паколькі яна трохкутная і не мае аналагаў ні ў Беларусі, ні ў Еўропе. Асаблівасць яе ў тым, што яна мае не толькі тры зводы, але і тры сцяны і трое дзвярэй. Першыя звесткі аб святыні адносяцца да 1747 года. Пабудова была драўляная і належала ўніятам. На жаль, да нашага часу не захавалася нават фрагментаў ад колішняга храма. У 1823 годзе Якуб Незабытоўскі на тым жа самым месцы пабудаваў царкву з бутавага каменю, якая поўнасцю адпавядала архітэктурным асаблівасцям папярэдняй. Толькі змянілася ўнутранае ўбранства: іканастас, алтар і хор сталі на сваё традыцыйнае месца, дзе знаходзяцца і цяпер.

Чаму трохкутная? Як кажуць мясцовыя жыхары: “Некалі даўно-даўно на гэтай мясцовасці жылі і ўніяты, і праваслаўныя, і каталікі. Дык вось, сабраўшыся ўсёй грамадой, яны пабудавалі дадзены храм і зрабілі для кожнай канфесіі свой уваход, а іканастас паставілі пасярод”.

Відаць, нам таксама неабходна задумацца аб тым, што вера, дружба, міласэрнасць, любоў да роднай зямлі яднае ўсіх людзей, якой бы веры яны не былі.

Такім чынам, царква ў Вялікай Сваротве разам з іншымі, якія захаваліся да нашых дзён і прызнаныя архітэктурнымі шэдэўрамі-помнікамі – гэта і ёсць увасабленне не толькі захавання старажытных асаблівасцей дойлідства, але і далейшага іх развіцця і ўзбагачэння ў перыяд росквіту мастацтва барока.

Трохкутная царква ў в. Вялікая Сваротва Баранавіцкага раёна – незвычайны архітэктурны помнік і ўнікальная святыня.

Адроджаныя храмы будуць стаяць вечна і з’яўляцца духоўнай асновай для жыхароў в. Пачапава і в.Вялікая Сваротва і прыхаджан з акаляючых вёсак.

Свята-Пакроўская царква ў в.Пачапава і Свята-Троіцкая царква ўсё выстаялі, перажылі цяжкія часы ганення і заняпаду. Быў час, калі замест свечак палілі храмы і гінулі людзі, але адроджаныя святыні будуць стаяць на зямлі вечна, як агульны помнік і спадзяванне на лепшае жыццё, а гукі адроджаных званоў храмаў будуць плысці разам з песняй жаўрука над прасторамі любай Беларусі.

Больш дзесяці гадоў адноўлены мясцовыя святыні. За гэты час вучні і настаўнікі ДУА “Навучальна-педагагічны комплекс Пачапаўская дзіцячы сад – сярэдняя школа” Баранавіцкага раёна сумесна з царквою, з настаяцелямі і прыхаджанамі храмаў здзейснілі шэраг паломніцтваў па святых землях не толькі Беларусі, але і суседняй дзяржавы, Расіі. Першае паломніцтва адбылося ў Свята-Успенскі Жыровіцкі мужчынскі манастыр. Неабходна адзначыць, што наш паважаны бацюшка пратыерэй Георгій Сапун скончыў Мінскую духоўную семінарыю пры гэтым жа манастыры. На жаль, бацюшкі няма ўжо на белым свеце, але ў нашай памяці ён застанецца назаўсёды, як сімвал дабрыні, нязломнай веры і самаахвярнасці, так як яму прыйшлося пражыць даволі нялёгкае жыццё, асабліва ў часы бязвер’я. Наступнае падарожжа адбылося ў Полацкі Свята-Еўфрасіньеўскі манастыр, па дарозе дамоў заехалі ў Мінскі Свята-Духавы кафедральны сабор. Аднойчы ў час летніх канікул адправіліся ў Расію ў Калужскую вобласць у Опціну Пустынь і Шамардзіно, у Казанскую Свята-Амвросіньеўскую жаночую пустынь. Дзеці былі вельмі задаволены тым, што змаглі пабыць у суседняй дзяржаве, змаглі параўнаць святыні дзвюх дзяржаў, змаглі захапіцца прыгажосцю велічавых храмаў і гасціннасцю мясцовых жыхароў.

Таксама былі ў Іаана-Кармянскім манастыры ў Гомельскай вобласці, наведалі Свята-Пятра-Паўлаўскі сабор у Гомелі, Свята-Елісавецінскі манастыр у Навінках, які знаходзіцца на тэрыторыі псіхіятрычнай бальніцы. Вучні даведаліся, што самай галоўнай мэтай манастыра з’яўляецца не толькі духоўная дзейнасці, але і сацыяльная дапамога хворым. Яшчэ манастыр займаецца

духоўна-асветніцкай дзейнасцю. Дзеці ўпершыню ўбачылі майстэрні, у якіх манахі пісалі абразы.

Усе гэтыя падарожжы па святых месцах аставілі ў душах дарослых і дзяцей самыя найлепшыя ўражанні.

Адной з традыцый нашай школы з’яўляецца наведванне Свята-Пакроўскага храма ў в.Пачапава на Дзень ведаў, першага верасня, і 31 мая на апошні званок. Наш малады бацюшка іерэй Віталь Вабішчэвіч падтрымлівае таксама гэту традыцыю, моліцца за дзяцей, бласлаўляе выпускнікоў на паспяховую здачу экзаменаў і паступленне ў выбраныя вучнямі навучальныя ўстановы, заклікае быць міласэрнымі да чужога гора, добрымі і чулымі да бліжніх, патрабавальнымі ў адносінах да сябе, вучыць жыць па запаведзях Божых.

Бацюшка выступае перад бацькамі на бацькоўскіх сходах. У пачатку 2018/2019 навучальнага года іерэй Віталь Вабішчэвіч адправіўся разам з вучнямі і настаўнікамі ў пешае паломніцтва па святых месцах малой радзімы.

Без мінулага не можа быць будучыні. Работа па развіцці маральнага пачатку ў дзецях складаная і ніколі не заканчваецца. Я спадзяюся, што добрае насенне прарасце ў дзіцячых душах і і нашы выхаванцы вырастуць добрымі, разумнымі, сапраўднымі грамадзянамі роднай краіны, самай прыгожай і міралюбівай.

Мастоўская Наталія Аляксандраўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
Дзяржаўнай установы адукацыі “Навучальна-педагагічны комплекс Пачапаўская дзіцячы сад – сярэдняя школа” Баранавіцкага раёна
8 (029) – 209-97-06 (МТС)